ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама
А.Л.Вярсоцкі
2016 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб абласным аглядзе-конкурсе культарганізатараў

I. Мэты і задачы:

1. патрыятычнае выхаванне моладзі праз новыя віды, формы актыўнага адпачынку;
2. папулярызацыя гульнёвага жанру ў вобласці;
3. стварэнне новых тэматычных гульнёвых праграм і далейшае выкарыстанне іх у сучасных мерапрыемствах;
4. выяўленне новых імёнаў сярод таленавітай моладзі;
5. павышэнне прафесійнага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства культарганізатараў, вядучых сюжэтна-забаўляльных праграм.

II. Парадак і ўмовы правядзення агляду-конкурсу.

Абласны агляд-конкурс культарганізатараў праводзіцца з сакавіка па лістапад 2016 года па асобнаму графіку. Заяўкі на ўдзел дасылаюцца да 20 лютага 2016 года па адрасе: 230025, г. Гродна, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", вул. Савецкая, 8.

У абласным аглядзе-конкурсе культарганізатараў прымаюць удзел народныя і ўзорныя аматарскія калектывы - тэатры і студыі гульні, лепшыя дарослыя і дзіцячыя школы (гурты) культарганізатараў, арганізатары вольнага часу насельніцтва – пераможцы раённых і гарадскіх тураў, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

На агляд-конкурс прадстаўляюцца тэматычныя, сюжэтныя і гульнёвыя праграмы для розных узроставых катэгорый працягласцю не больш за 20 хвілін.

III. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў агляду-конкурсу.

Пры падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу ўлічваецца:

III. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў агляду-конкурсу.

Пры падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу ўлічваецца:

1. артыстызм, арыгінальнасць выканання, сцэнічная культура і ўзровень выканальніцкага майстэрства;

2. выкарыстанне сучаснага і традыцыйнага рэгіянальнага матэрыялу;

3. мастацкі ўзровень рэпертуару.

Журы абласнога агляду-конкурсу вызначае пераможцаў і ўзнагароджвае дыпломамі і прызамі лаўрэатаў I, II, III ступені ў 2-х намінацыях:

1. лепшая музычна-забаўляльная праграма;

2. лепшая пазнавальна-гульнёвая праграма.

Таксама ўдзельнікі ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі і прызамі:

- за артыстызм;
- за лепшае рэжысёрскае вырашэнне;
- за ўдалае выкарыстанне рэгіянальнага матэрыялу ў праграме;
- за лепшую тэатралізацыю праграмы;
- за ўдалае раскрыццё тэматыкі агляду-конкурсу культарганізатараў.

Усе калектывы – ўдзельнікі, якія не сталі пераможцамі агляду-конкурсу, ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

Журы пакідае за сабой права змяняць намінацыі, а ў выпадку адсутнасці конкурсу ў намінацыі, аб'ядноўваць іх.

Падвядзенне вынікаў агляду-конкурсу "На солнечной поляночке" адбудзецца ў лістападзе 2016 г. на абласным семінары дырэктараў раённых метадычных цэнтраў народнай творчасці, раённых Дамоў культуры.

Пераможцы абласнога агляду-конкурсу культарганізатараў "На солнечной поляночке" будуць рэкамендаваны да прысваення наймення "народны" ("узорны") непрафесійны (аматарскі) калектыў мастацкай творчасці Рэспублікі Беларусь і да ўдзелу ў абласных і рэспубліканскіх мерапрыемствах.

IV. Фінансаванне.

Фінансаванне выдаткаў на правядзенне абласнога агляду-конкурсу культарганізатараў ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту (набыццё прызоў, рамак і дыпломаў), прадугледжаных на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела
ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі
райгарвыканкама

. 2016 г.

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у абласным аглядзе-конкурсе культарганізатараў**
**«На солнечной поляночке»**

1. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці (прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка)________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________

2. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву, пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выданы)__________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________

3. Колькасць удзельнікаў калектыву________________________________

4.Жанравы накірунак, назва праграмы, аўтар__________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________

5. Дата паказу конкурсных праграм________________________________

6. Адрас і кантактныя тэлефоны__________________________________

Подпіс кіраўніка
базавай установы культуры _______________

Заяўкі на ўдзел у аглядзе – конкурсе дасылаць да 20 лютага 2016 года па адрасе: 230025, г. Гродна, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, вул. Савецкая, 8; электронны адрас: onmcnt@tut.by
Кантактныя тэлефоны ў г. Гродна: 72 12 59, м.т. 6562294 (мтс), тэл/факс 72 27 04